# Задачкі і рэбусы на фінансавую граматнасць

**1.** Сямейны бюджэт сям'і Алесіка складае 1800 рублёў штомесяц. 1/4 сродкаў выдаткоўваецца на прадукты, 150 рублёў на абавязковыя плацяжы, 2/9 сродкаў бацькі Алесіка кладуць у банк на дэпазіт. Колькі грошай застаецца на іншыя выдаткі?

| | | | |
|---|---|---|---|
| а) 500; | **б) 800;** | в) 1000; | г) 1200. |

**2.** Алесік вырашыў дастаць з капілкі ўсе свае грошы і пакласці іх на рахунак у Белаграпрамбанк. Дапамажы яму падлічыць грошы, калі ў яго капілцы ляжаць манеты рознай вартасці.



| | | |
|---|---|---|
| 10,0... BYN | 17,0... RUB | 7,50... EUR |

**3.** Алесік і Стэфка вырашылі разабрацца, ці прыносяць прыбытак розныя віды грашовых аперацый у банку. Дапамажыце дзецям суаднесці від грашовай аперацыі з відам прыбытку, які ён прыносіць.

| | |
|---|---|
| Набыццё мерных зліткаў... | ...не прыносіць прыбытку |
| Набыццё аблігацый... | ...прыносіць фіксаваны прыбытак |
| Набыццё памятных манет... | ...прыносіць прыбытак, калі пашанцуе |
| Набыццё латарэйнага білета... | ...не прыносіць прыбытку і патрабуе выдаткаў |
| Банкаўскі крэдыт... | ...прыносіць прыбытак, калі вартасць каштоўных металаў вырасце |



**4.** Белаграпрамбанк у родным горадзе Алесіка і Стэфкі налічвае на тэрміновы ўклад 10% (1/10) гадавых. Бацька Алесіка пералічыў на рахунак 3000 рублёў. Якая сума будзе на гэтым рахунку праз год, калі ніякіх аперацый, акрамя налічэння працэнтаў, з рахункам адбывацца не будзе?

а) 3100; **б) 3300;** в) 3600; г) 3900.

**5. Дапамажыце Алесіку знасці словы.**

| | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| У | Б | А | Р | Т | Д | Э | П | А | З |
| К | Л | А | Д | А | Р | К | Р | Э | І |
| Э | Ж | Д | Ю | Б | К | Н | А | Д | Т |
| Т | І | С | Р | Е | А | Э | М | Ы | Н |
| А | Я | Т | С | В | Н | Д | І | Т | А |
| К | Ў | А | З | Н | А | Б | Н | Ў | Я |
| Т | А | Л | О | К | Ы | Ц | А | Н | А |
| А | А | Т | О | Н | Я | Я | Ы | Ы | Б |
| Б | А | Н | К | А | М | А | Ц | Я | Л |
| В | А | Л | Ю | Т | А | Т | А | Г | І |

1. Грошы, перададзеныя банку пад працэнт. ***(Уклад)***
2. Грошы, якія банк пазычае пад працэнты. ***(Крэдыт)***
3. Сінонім да слова "ўклад". ***(Дэпазіт)***
4. Абмен тавармі або паслугамі. ***(Бартар)***
5. Так называюць грошы іншых краін. ***(Валюта)***
6. Прылада, якая выдае грошы на рукі кліенту банка. ***(Банкамат)***
7. Назва папулярнага каштоўнага металу. ***(Золата)***
8. Памер прыбытку ад уклада – гэта працэнтная… ***(Стаўка)***
9. Грашовы знак на аснове паперы. ***(Банкнота)***
10. Схема прыбыткаў і расходаў пэўнага аб'екта. ***(Бюджэт)***
11. Абмен аднаго віда замежных грошай на іншы. ***(Канверсія)***
12. Манеты і купюры ў нашых руках – гэта … грошы. ***(Наяўныя)***
13. Каштоўная банкаўская папера, якая дае фіксаваны прыбытак. ***(Аблігацыя)***
14. Змена вартасці грашовых знакаў з мэтай спрашчэння разлікаў. ***(Дэнамінацыя)***

**6. Праўда ці не?**

| | Банк… | Так | Не |
|---|---|---|---|
| 1. | … плаціць працэнты ўкладчыкам | ● | |
| 2. | … плаціць працэнты тым, хто бярэ крэдыты | | ● |
| 3. | … прадае памятныя манеты Рэспублікі Беларусь | ● | |
| 4. | … прадае грошы, што выйшлі з ужытку | | ● |
| 5. | … дае магчымасць атрымаць віртуальную картку | ● | |
| 6. | … дае магчымасць атрымаць дысконтную картку | | ● |
| 7. | … можа захоўваць Вашыя каштоўныя паперы | ● | |
| 8. | … можа захоўваць Вашыя асабістыя рэчы | | ● |
| 9. | … прадае латарэйныя білеты | ● | |
| 10. | … прадае білеты ў тэатр | | ● |

**8. Расшыфруйце рэбус.**




*Уклад*




*Дэпазіт*



*Банк*




*Крэдыт*




*Валюта*




*Пін-код*




*Картка*




*Манета*

Правільныя
адказы шукай на сайце
Белаграпрамбанка
www.belapb.by.

Ці адсканіруй QR-код
сваім смартфонам.

